Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суд па "справе ўзлому кампутарнай сістэмы Мінгарвыканкама" зрабілі закрытым

24.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед, палітвязні

У судзе Заводскага раёна Мінска 24 лістапада пачалося судовае разбіральніцтва па «справе ўзлому кампутарнай сістэмы Мінгарвыканкама». Фігурантамі гэтай справы выступаюць палітзняволеныя браты Кім і Аляксей Самусенкі, Павел Дрозд і Іван Андрушойць. Іх дзеянні кваліфікаваныя паводле шасці артыкулаў Крымінальнага кодэкса: ч. 1 арт. 350 (мадыфікацыя кампутарнай інфармацыі), арт. 352 (неправамернае завалоданне кампутарнай інфармацыяй), ч. 1 арт. 354 (выкарыстанне шкоднасных кампутарных праграм), ч. 1 арт. 342 (актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак), арт. 341 (псаванне маёмасці ў грамадскіх месцах), ч.1 арт. 13, ч. 2 арт. 293 (падрыхтоўка да ўдзелу ў масавых беспарадках). Справу супраць палітвязняў разглядае суддзя Жанна Хвойніцкая. Суд зрабілі закрытым, прычына — *"у матэрыялах крымінальнай справы ўтрымліваюцца звесткі, якія складаюць дзяржаўную таямніцу"*.



Палітзняволеныя Аляксей і Кім Самусенкі, Іван Андрушойць, Павел Дрозд

Каго судзяць?

На лаве падсудных адразу чатыры палітвязняў, якіх трымаюць пад вартай ужо больш за год.

32-гадовага заснавальніка і члена Рады грамадскага руху "Дзея" **Кіма Самусенка** затрымалі 3 лістапада мінулага года па падазрэнні ва ўзломе кампутарнай сістэмы Мінгарвыканкама (ч. 2 арт. 349 КК) і дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, у Мінску з 9 жніўня (ч. 1 арт. 342 КК). Пасля жорсткага ператрусу, які суправаджаўся стрэламі ў доме і прымяненнем фізічнай сілы, сілавікі забралі ўсю тэхніку Кіма і яго жонкі, зарэгістраваную паляўнічую зброю, грошы, БЧБ-сцяг, сцяг Украіны, украінскі пашпарт жонкі і іншае.

Праз два дні быў затрыманы і брат Кіма — 33-гадовы **Аляксей Самусенка**. Ён эканаміст, працаваў у сетцы фірмаў, якія займаюцца вырабамі з пластыка.

Таксама па гэтай справе былі затрыманыя 35-гадовыя **Павел Дрозд** і **Іван Андрушойць**. Іван больш чым праз чатыры месяцы зняволення ажаніўся ў СІЗА на сваёй дзяўчыне **Соф'і**.



На заснавальніка “Дзеі” ўзбудзілі дзве крымінальныя справы. Адна з іх — за ўзлом сістэмы Мінгарвыканкама

Затрыманага 3 лістапада заснавальніка і сябра рады грамадскага руху “Дзея” Кіма Самусенку падазраюць ва ўзломе кампутарнай сістэмы Мінгарвыканкама (ч. 2 арт. 349 КК) і дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, у Мінску з 9 жніўня (ч. 1 арт. 342 КК).

У чым іх абвінавачваюць?

Паводле звестак следства *"у начны час у кастрычніку і лістападзе мінулага года 35-гадовы мужчына, знаходзячыся на тэхнічным паверсе будынка на вуліцы Прытыцкага ў Мінску, з дапамогай кампутарнай тэхнікі шляхам парушэння сістэмы абароны і выкарыстання шкоднаснага праграмнага забеспячэння ажыццявіў несанкцыянаваны доступ да інфармацыі, якая захоўваецца ў кампутарнай сетцы Мінскага гарадскога выканкама. У выніку названых дзеянняў фігурант завалодаў запісамі камер відэаназірання, устаноўленых у сталіцы, з мэтай наступнай публікацыі на розных інтэрнэт-рэсурсах, у тым ліку дэструктыўных і экстрэмісцкіх Telegram-каналах.*

Згодна з матэрыяламі крымінальнай справы, абвінавачаныя з дапамогай шкоднаснага ПЗ атрымалі доступ да кампутарных сістэм КУП "ЦІТ Мінгарвыканкама" і ГУУС Мінгарвыканкама, што пацягнула за сабой парушэнне нармальнай працы прадпрыемстваў і дзяржорганаў, а таксама ***гэтыя асобы скапіявалі і выдалілі файлы розных фарматаў і ўнеслі ў іх загадзя ілжывую інфармацыю.***

У ходзе расследавання крымінальнай справы дакладна ўстаноўлена, што ўсе мужчыны сістэматычна прымалі ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, якія адбываліся ў Мінску са жніўня па лістапад 2020 года, спалучаных з блакаваннем дарог і непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады. Следствам зафіксавана 10 фактаў іх удзелу".

Падчас правядзення ператрусаў канфіскаваныя рэчавыя доказы, у тым ліку зарэгістраваная агнястрэльная зброя «Тыгр», «Сайга-МК», «ІЖ-54», патроны, Бронекамізэльку, каскі, мячы, радыёстанцыі з гарнітурай для схаванага нашэння, улёткі з заклікамі да страйку і піратэхніка.

Дзеянні палітвязняў кваліфікаваныя па наступных артыкулах Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь:

- ч. 1 арт. 342 (актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак);
- арт. 341 (псаванне маёмасці ў грамадскіх месцах);
- арт. 13, ч. 2 арт. 293 (падрыхтоўка да ўдзелу ў масавых беспарадках);
- арт. 350 (мадыфікацыя кампутарнай інфармацыі);
- арт. 352 (неправамернае завалоданне камп'ютарнай інфармацыяй);
- арт. 354 (выкарыстанне шкоднасных кампутарных праграм).

Першапачаткова супраць іх распачалі крымінальную справу па ч. 2 арт. 349 Крымінальнага кодэкса Беларусі (несанкцыянаваны доступ да камп'ютарнай інфармацыі, учыненым групай асоб па папярэдняй змове з іншай асабістай зацікаўленасці), аднак яе спынілі ў сувязі з уступленнем у сілу закона, якая лікваідавала каральнасць дзеянняў.

Суд па справе зрабілі закрытым, прычына — "у матэрыялах крымінальнай справы ўтрымліваюцца звесткі, якія складаюць дзяржаўную таямніцу".

Падтрымаць палітвязняў можна па адрасе:

СІЗА-1, 220030, г. Мінск, вул. Валадарскага, 2

Твитнуть









Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY